# ГАЛОЎНЫЯ І ДАДАНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА. 5 КЛАС

**Машканава Святлана Аляксандраўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА "Суражская сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза
М.П. Шмырова"

***Родная мова – крыніца ведаў і натхнення!***

*Дадзены ўрок праводзіцца пасля вывучэння тэмы "Галоўныя і даданыя члены сказа". На ім вучні сістэматызуюць атрыманыя веды. Падабраныя заданні спрыяюць паўтарэнню тэарэтычнага матэрыялу і прымяненню практычных навыкаў па тэме.*

**Тэма:** Галоўныя і даданыя члены сказа

**Мэта:** фарміраваць уяўленне пра ролю кожнага даданага члена ў складзе сказа і вызначаць, якімі часцінамі мовы яны выражаны.

**Тып урока:** абагульненне і сістэматызацыя ведаў.

**Прымяненне тэхналогій:** элементы крытычнага мыслення.

**Формы работы:** індывідуальная, работа ў пары.

**Прыём:** мазаіка (на дошцы змяшчаецца мазаіка, трэба скласці яе так, каб даведацца, як гучыць тэма).

**Задачы:**

» спрыяць паглыбленню ведаў вучняў пра галоўныя і даданыя члены сказа;

» садзейнічаць выпрацоўцы ўменняў вызначаць і адрозніваць галоўныя і даданыя члены сказа;

» спрыяць выхаванню павагі да роднай мовы.

**Этапы ўрока:**

***I. Арганізацыйна-матывацыйны этап***

Настаўнік (чытае ўрывак з верша Анатоля Грачанікава "Зіма").

Святлее неба парасон,
Сняжынак ціхі перазвон.
І дрэвы ў казачным убранні
Страсаюць іней з голля ўранні.
Бадзёрыць нас прыход зімы.
Святлее свет – святлеем мы.

– Сапраўды, не так і доўга засталося нам чакаць зіму, з марозам, са снегам. Але любая пара года прыгожая па-свойму. Хто з вас любіць зіму? Чаму вы любіце зіму? Спадзяюся, што мы з вамі сёння на ўроку добра папрацуем, даведаемся шмат новага і цікавага.

***II. Вызначэнне тэмы і задач урока (стварэнне праблемнай сітуацыі)***

– Паглядзіце на дошку, тэма ўрока не запісана: словы пераблыталіся. Трэба пераставіць словы так, каб атрымалася тэма нашага сённяшняга ўрока.

» Якія члены сказа нам ужо вядомы?

» Які член сказа называецца дзейнікам? Выказнікам?

» Як называецца сказ, у якім ёсць толькі галоўныя члены сказа?

» Які сказ называецца развітым?

» Якія даданыя члены сказа вы ведаеце?

» Пра што мы сёння даведаемся на ўроку? Чаму будзем вучыцца?

На дошцы запісаны задачы ўрока:

Даведаемся:

1. Якія члены сказа з'яўляюцца … і …?
2. На якія … адказваюць … і … ?
3. Што абазначаюць … і …?

Навучымся:

1. Знаходзіць у сказе … і …
2. Ставіць пытанні да … і …

(Вучні вызначаюць задачы ўрока, дадаючы неабходныя словы.)

***III. Актуалізацыя ведаў***

1. – Давайце вернемся да эпіграфа ўрока. Знайдзіце ў кожным сказе галоўныя і даданыя члены сказа. Развітыя сказы або не?

2. Вучні індывідуальна запаўняюць "Табліцу з белымі плямамі". У час працы яны могуць карыстацца падручнікам.







Даданыя члены сказа

| Даданыя члены сказа | Што абазначаюць? | На якія пытанні адказваюць? | Чым выражаюцца? | Графічнае абазначэнне |
|---|---|---|---|---|
| 1. дапаўненне | прадмет | Пытанні ўскосных … **склонаў** | Назоўнікам, займеннікам | --------------- |
| 2. … **азначэнне** | ... **прымету прадмета** | ... **які? якая?якое? якія? чый? чые? чыё? чыя?** | Прыметнікам, займеннікам, іншымі часцінамі мовы | |
| 3. … **акалічнасць** | Месца, …**час**, спосаб дзеяння | … **дзе?куды**? адкуль?як? | Назоўнікам з прыназоўнікам, **прыслоўем** | |

3. – Падбярыце прыметнікі да слоў

| Назоўнікі | Які? (якая? якое?), чый? (чыя? чыё?) |
|---|---|
| зямля<br>мова<br>Беларусь<br>бусел<br>лес<br>рака | |

***IV. Дынамічная паўза***

Вучні выходзяць да дошкі і прымацоўваюць пытанні да слоў: дапаўненне, азначэнне, акалічнасць.

*каго? чаго?; каму? чаму?; каго? што?; кім? чым?; аб кім? аб чым?; як?; дзе; куды?; навошта?; які?; якая?; якія?; якое?; чый?; чыя?; чыё?*

4. – На дошцы запісаны неразвіты сказ. Як можна развіць гэты сказ?

*Выпаў снег.*

*(Раніцай на галінкі дрэў выпаў пушысты снег.)*

Творчае заданне: скласці некалькі сказаў на тэму “Мая родная мова”

(індывідуальнае заданне на 9–10 балаў).

***V. Кантрольна-рэфлексійны этап***

Лічбавы дыктант

Згодзен (згодна) – 1, не згодзен (не згодна) – 0.

1. Граматычную аснову сказа ўтвараюць галоўныя члены – дзейнік і выказнік. (1)

2. Дзейнік абазначае тое, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе, і адказвае на пытанні хто? што? (1)

3. Выказнік называе дзеянне, стан ці прымету дзейніка і адказвае на пытанні што робіць прадмет? які прадмет? хто такі прадмет? (1)

4. Выказнік выражаецца назоўнікам у назоўным склоне. (0)

5. Калі дзейнік і выказнік выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону, то паміж імі ставіцца працяжнік. (1)

6. Дапаўненне – галоўны член сказа, які абазначае прадмет і адказвае на пытанні ўскосных склонаў. (0)

7. У сказе дапаўненне выражаецца назоўнікам ці займеннікам і залежыць ад выказніка. (1)

8. Азначэнне – даданы член сказа, які абазначае прымету прадмета і адказвае на пытанні які? якая? якое? якія? чый? чыя? чые? (1)

9. Акалічнасць – галоўны член сказа, які абазначае месца, час, прычыну, спосаб дзеяння. (0)

– Заканчваецца наш урок. Давайце падвядзём вынікі. Над якой тэмай мы працавалі? Пра што вы даведаліся? Якія цяжкасці ў вас узніклі? Ці справіліся вы з імі?

***VI. Дамашняе заданне***

Выканаць практыкаваннне 169 або скласці некалькі развітых сказаў на тэму “Мая Беларусь” (9–10 балаў).